# Спадчына Францішка Багушэвіча захоўваецца і вывучаецца

19 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася прэзентацыя электроннага праекта "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай", прысвечанага 180-тай гадавіне з дня народзінаў Францішка Багушэвіча.



Словы Ф. Багушэвіча напярэдадні Дня роднай мовы гучаць асабліва актуальна. Да яго спадчыны звярталіся Янка Купала, Максім Багдановіч, Цётка, паэты, пісьменнікі і выдаўцы пачатку XX стагоддзя, яго спадчыну вывучалі беларусы эміграцыі. Не была яна забытай і за савецкім часам. Зараз словы паэта і прарока знаёмы многім са школьных гадоў. Яму прысвячаюцца выдавецкія праекты і кніжныя выстаўкі. Новы электронны рэсурс дапаўняе і абагульняе ўсё, што было зроблена раней.



У ім сабраны вялікі пласт матэрыялаў, фотаздымкі, рэпрадукцыі твораў беларускіх мастакоў, прысвечаныя Багушэвічу. Тут сабраны адлічбаваныя копіі прыжыццёвых вы-



данняў паэта, ёсць бібліяграфічны паказальнік, які ўключае выданні Ф. Багушэвіча ад 1909 года да нашых дзён. У другім раздзеле сабраныя публікацыі, якія прысвечаны жыццю і творчасці Францішка Багушэвіча. Сярод іх прадстаўлены кнігі вядомага літаратуразнаўцы Уладзіміра Ілліча Содаля, які шчыра, грунтоўна і дасканала даследваў жыццёвы лёс і творчую спадчыну Багушэвіча. Электроннае выданне Нацыянальная бібліятэка пачынала ствараць яшчэ пры жыцці Уладзімір Ілліча, у 2009 годзе.

На прэзентацыі новага праекта прысутнічалі родныя даследчыка - Клара Барысаўна Содаль, яго дзеці Аксана Уладзіміраўна і Марат Уладзіміравіч, і мастак Мікола Купава.

- Я вельмі задаволена, што за чатыры гады, якія прайшлі пасля адыходу Уладзіміра Ілліча, - распавяла Клара Барысаўна - мы паставілі яму помнік і выдалі кнігу ўспамінаў пра яго, якая таксама з'яўляецца яму помнікам і падарункам ад нас. Я вельмі ўдзячна Міхасю Скоблу, які разам з маёй дачушкай Аксанай прыклаў шмат намаганняў, каб апрацаваць і ўкласці ўсе тэксты. На прэзентацыю кнігі ў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прыйшлі яго сябры і паплечнікі і вельмі шмат моладзі.

Сям'я Содаляў перадала асобнікі новай кнігі " Буйніцы і драбніцы" і ранейшыя выданні пісьменніка ў залу беларускай літаратуры.

- Улетку ў нашым філіяле ў Кушлянах адбудзецца фэст, прысвечаны Ф. Багушэвічу, і мы будзем рады сустрэць усіх, хто захоча наведаць гэтае мерапрыемства, - паведаміў дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Удзельнікі тэатра "Жывое слова" Алесь Мойскі і Алеся Сівохіна выразна па-мастацку прадэкламавалі творы Францішка Багушэвіча.

У Менску будзе адчынена станцыя метро імя Ф. Багушэвіча.

*Эла Дзвінская,*
*фота аўтара.*